# ПАЛІТЫЧНЫ МЕДЫЯТЭКСТ НА БЕЛАРУСКІМ ТЭЛЕБАЧАННІ (на матэрыяле рубрыкі Ігара Тура «Будет дополнено»)

**В. М. Самусевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*samusevich@bsu.by*

У матэрыяле даследуецца палітычны тэкст, які актуалізаваўся ў сучаснай інфармацыйнай сферы. Вызначаецца яго спецыфіка на беларускім тэлебачанні.

***Ключавыя словы:*** тэлебачанне; эфір; аналітыка; аўтарскі стыль; грамадска-палітычнае вяшчанне.

# A POLITICAL MEDIA TEXT ON THE BELARUSIAN TELEVISION (on the example of Igor Tur's rubric «Will be added»)

**V. M. Samusevich**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. M. Samusevich (samusevich@bsu.by)*

The article researches a political text which is updated in contemporary informational sphere. Its specificity on the Belarusian television is defined.

***Key words:*** television; broadcasting; analytics; author's style; social and political broadcasting.

Пад палітычным медыятэкстам мы будзем разумець тэкст (вербальны, аўдыяльны, аўдыявізуальны), у якім размова ідзе аб актуальных палітычных пытаннях і які звернуты да масавай аўдыторыі [Гл.: 3].

Звернемся да аналізу матэрыялу «Почему в Беларуси больше не будет, как раньше, и началом чего стала смерть офицера КГБ?» рубрыкі Ігара Тура «Будет дополнено» (https://ont.by/news/pochemu-v-belarusi-bolshe-ne-budet-kak-ranshe-i-nachalom-chego-stala-smert-oficera-kgb-rubrika-budet-dopolneno), які з'яўляецца палітычным медыятэкстам, паколькі паднімае палітычныя

праблемы. Удакладнім, што палітычнымі праблемамі прынята называць актуальныя пытанні, звязаныя: а) з размеркаваннем уладных паўнамоцтваў, непасрэдна з палітычнай уладай; б) з палітычнай стратыфікацыяй грамадства, са структурай улады; в) з палітычным кіраваннем грамадствам. Пры гэтым любы палітычны тэкст у медыяпрасторы стратэгічна накіраваны на змену ці падтрымку бягучай палітычнай сітуацыі, на пераразмеркаванне ўладных паўнамоцтваў ці падтрымку існуючай улады [Гл.: 1].

Зразумела, што палітычныя тэксты дзяржаўных медыя арыентаваны не толькі на падтрымку існуючых дзяржаўных інстытутаў і рэалізуемай у краіне дзяржаўнай палітыкі, але і на актыўную прапаганду ідэй, меркаванняў, каштоўнасцяў уладных структур. Адзначым, што прапаганда, на наш погляд, з'яўляецца самым дзейсным інструментам сацыяльна-абумоўленага канструявання карціны свету пасродкам вызначанай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці.

Паколькі чытач заўсёды атрымлівае інтэрпрэтацыю інфармацыі, любы журналісцкі тэкст з'яўляецца аўтарскім, таму поруч з такім спосабам камунікатыўнага ўплыву як перакананне, важным фактарам у медыятэкстах з'яўляецца ацэначнасць. Сутнасць дзейнасці аўтара/журналіста палітычнага тэксту – ацэнка актуальнага і ўкараненне гэтай ацэнкі ў масавую свядомасць. Напрыклад: «Андрей снимал свой выстрел на камеру… Для хайпа, который так требуют в Сети. Хайп был, но посмертно. Его вот пытаются героизировать. Но он не защищал свою семью, не защищал жилье, не участвовал в какой-то борьбе. Он зарядил ружье, взвел, дождался – и выстрелил в человека. Он убийца и террорист. Все».

Асноўная мэта аўтара пры пабудове палітычнага тэксту – дамагчыся найлепшага эфекту ўздзеяння на аўдыторыю. У сувязі з гэтым ключавой функцыяй, на наш погляд, з'яўляецца прагматычная, адсюль патрабаванне: тэкст павінен быць зразумелы для аўдыторыі, ідэйна канкрэтны і змястоўна дакладны.

Традыцыйна выдзяляюць тры спосабы аргументацыі: да розуму (лагічная аргументацыя), да маралі (каштоўнасная аргументацыя) і эмацыйна-псіхалагічныя заклікі (эмацыянальная аргументацыя). Як правіла, у палітычных медыятэкстах гэтыя спосабы спалучаюцца, што дазваляе дасягнуць найбольшай пераканаўчасці. Напрыклад: «Как и вчера, общество поддержало семью погибшего Димы "Нирваны", и писали искренние слова соболезнования далеко не только те, кто за государство, за Лукашенко и вообще за политику и политизацию. Это горе, это трагедия, это то, чего боятся все в любом адекватном обществе, потому что насилие в сторону правоохранителей

лавинообразно, и где одна смерть – там могут быть еще, и вот этого сейчас боятся все».

Аўтарская журналістыка ці публіцыстыка прадугледжвае пазіцыю наглядальніка палітычнага працэсу, і аўдыторыя чакае ад публіцыста ацэнкі, зробленай на аснове аб'ектыўнага аналізу, з прадстаўленнем іншых меркаванняў. Пазіцыя наглядальніка не адбірае ў публіцыста ні магчымасці спачуваць, ні права на суб'ектыўнасць. У той жа час найбольшы накал і пераканаўчасць тэксту назіраецца, калі аўтар/журналіст не проста наглядальнік, а суб'ект палітычных працэсаў, які ўключаны ў яго ў рознай ступені і ў розных ролях. Напрыклад: «Я поясню, почему я сегодня снова в эфире. Вот один из журналистов, которого в этом году предлагалось убить. Как вы можете заметить – это я. И читать "а давайте убьем Тура или хотя бы покалечим" было, скажем так, не очень приятно. Это все было в Интернете, да. И я и про себя прочел, мол, ой, да ничего страшного, это просто разговоры в чатах, за это нельзя жестко наказывать. Ну-ну… Потом попробовали убить моего коллегу Азаренка, потом депутата Гайдукевича. Да, ничего не вышло, и по причине криворукости убийц, и благодаря работе спецслужб. Сотрудником которых был погибший вчера боец КГБ Дмитрий с позывным «Нирвана». И когда мы рассказывали и показывали, как готовились покушения на Гайдукевича, на Азаренка, на меня – часть общества, самая отвратительная для меня, и я ой как имею право так считать, писали – "ну, не убили же и не покалечили, чего распереживались?" С весны этого года, увы, было очевидно, что рано или поздно вся эта писанина в интернете, которая "берите в руки оружие и сопротивляйтесь!", приведет к чьей-либо смерти. Может, к моей, может, к вашей, зритель».

Адзначым, што структура палітычнага медыятэксту – гэта больш высокая ступень арганізацыі тэксту: яна ўключае змястоўны ўзровень (тое, што прама сказана), узровень рытарычных сродкаў (тое, як сказана) і ўзровень апрыёрных спасылак (ідэі, прадстаўленні, што ляжаць у аснове выказвання).

Аўтар часткова абмежаваны ў сваіх трактоўках і ў выбары сродкаў, у тым ліку і моўных, паколькі ў дзяржаўных медыя існуе канкрэтная рэдакцыйная палітыка, аднак у аўтара заўсёды ёсць выбар слоў і форм, якія найлепшым чынам адлюструюць яго думкі і меркаванні. Гэты выбар і вызначае той факт, што нельга гаварыць пра поўную аб'ектыўнасць. Напрыклад: «И плевать на законы, иногда не до них и их можно и поменять – вчера последняя красная черта была пресечена и мосты сожжены».

Формы і прыёмы могуць быць эксплiцытнымі і імпліцытнымі. Так, яўнымі прыёмамі з'яўляюцца:

1) пабудова тэксту, спосаб падачы матэрыялу (з чаго пачынае, як развівае думку, чым заканчвае, дзе кульмінацыйны момант і інш.). Напрыклад: «Меня зовут Игорь Тур, и я дополню тему»;

2) рытарычныя сродкі і фігуры: вобразныя сродкі, слэнгавыя элементы, рознастылявая лексіка, рытарычныя пытанні, тыпы вобразаў (рацыянальныя, эмацыянальныя, каштоўнасныя); напрыклад: «И те люди, кто просто писал в интернете, травил, угрожал и оскорблял, которые потом пускают сопли в ГУБОПиКе и просят прощения, мол, я же просто писал – вы, именно вы убили вчера двух людей. Их убила ваша писанина, их убило ваше “сопротивляйтесь режиму!” и “берите в руки оружие!”. Вы виноваты в этих смертях. И особенно те, кто писал гадости в сторону погибшего сотрудника КГБ. Этого нигде не будет прописано, но вы, писаки, будете отработаны как соучастники убийства и как террористы. Жестко, но не жестче, чем то, что вы писали вчера и писали в принципе»;

3) граматычная пабудова (інверсія, паўторы, заклікі, звароты). Напрыклад: «Зачем она снимала на видео? Не знаю, но, похоже, ради *хайпа* в интернете. И муж ее убил сотрудника КГБ ради *хайпа*. И сам ради *хайпа* погиб, хотя *хайп* – это в интернете, а в жизни Андрей – убийца и террорист. И *хайп* случился, ведь, кроме соболезнований, писали и гадости»;

4) аргументатыўныя, лагічныя прыёмы: спосаб развaг і прадстаўленне аргументаў і фактаў (тэзісная падача ці разгорнутая, мадальнасць, дэкларацыйнасць і пад.); напрыклад: «Даже к оппонентам я обращусь в первую очередь – неужели вы думаете, что вся эта вакханалия, которая тянется с прошлого года, нужна им – чекистам, ОМОНовцам, следователям? Эти разборки с митингующими, тонны уголовных дел, бессонные ночи одна за другой? Им это разве надо?»;

5) візуальна-графічная акцэнтуалізацыя (у тэкстах газетных – курсіў, шрыфт, знакі і інш., у аўдыяльных – гук, паўзацыя, любыя знакі інтанацыйнай выразнасці, у аўдыявізуальных – фонавая графіка, складнікі стылю вядучага/аўтара (манера, выгляд, індывідуальны стыль, эмацыйнасць і інш.).

Звернем увагу, што да аўтара/журналіста палітычнага медыятэксту прад’яўляюцца найбольшыя патрабаванні: ідэйна-маральныя якасці, дзелавыя якасці, характаралагічныя якасці, фізічныя якасці, а таксама важна эрудыцыя, культура маўлення, валоданне тэорыяй і практыкай журналістыкі, г. зн. прафесійны вопыт і майстэрства [Гл.: 2]. Усімі гэтымі якасцямі і ведамі валодае вядучы рубрыкі «Будет дополнено» Ігар Тур.

Можам абагульніць задачы палітычнага медыятэксту: 1) прыцягненне ўвагі да праблемы; 2) ідэалагічная задача (бачанне сітуацыі і шляхі

вырашэння існуючых праблем); 3) перакананне аўдыторыі ў правільнасці пастаўленых праблем і прапанаваных шляхоў іх рашэння; 4) мабілізацыя аўдыторыі на падтрымку прапаноў/ідэй аўтара. Усе пералічаныя задачы выконвае медыятэкст Ігара Тура. Адзначым, што не ў кожнага аўтара ёсць у тэксце яркі мабілізацыйны пачатак – спроба звароту да пачуццяў усіх удзельнікаў тэлекамунікацыі, незалежна ад палітычнай пазіцыі. Аднак у аналізуемым матэрыяле ён ёсць і знаходзіцца ў адной з моцных тэкставых пазіцый – напрыканцы праграмы: «Оппоненты… Раньше вы противостояли нам, "ябатькам", как вы называете. Но наши с вами разборки уже не особо интересовали тех, кто посередине, не с теми и не с другими. Но вы убили офицера. И сейчас те, кто был нейтрален, лучше понял, кто вы и зачем вы это делаете. Знаете, у нас недавно был День народного единства. Но теперь у нас есть еще одна дата, оппоненты-радикалы – День народного единства против вас, против террора, и это 28 сентября. И мы, будьте уверены, не забудем, не простим. А главных террористов – Тихановскую, Латушко, Цепкало и прочих – нужно достать из любой точки на карте и приволочь в Минск».

Для палітычнага аглядальніка неабходна навучыцца адчуваць, што важна: трэба не толькі разумець падзеі з пункту гледжання палітычнай актуальнасці, але і ўмець ацэньваць магчымую рэакцыю сваёй аўдыторыі як часткі грамадства. Палітычны медыятэкст можна назваць эфектыўным, калі ўсе пастаўленыя задачы будуць выкананы, а аўтар здолее давесці свае развагі і ідэі не толькі сваім прыхільнікам, але і апанентам. У гэтым рэчышчы медыятэксты Ігара Тура з'яўляюцца ўзорнымі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Алтунян А. Г.* Анализ политических текстов: учеб. пособие. М.: Логос, 2014. 384 с.
2. *Богуславская В. В.* Моделирование текста: лингвосоциокультурная концепция. Анализ журналистских текстов. Изд. 4-е. М.: Изд-во ЛКИ, 2013. 280 с.
3. Язык СМИ и политика / Под ред. Г. Я. Солганика. М.: Изд-во Московского университета; Факультет журналистики МГУ им. М. В. Ломоносова, 2012. 952 с.